ростам пераважна высокі (не рэдкасць бамбізы па два метры ростам). На поўдні часцей трапляюцца людзі сярэдняга росту, больш прыземістыя, затое больш каржакаватыя.

2. Любоў да працы.

Зямляк наш вызначаецца і ўтрапёнай любоўю да працы. Я нават сказаў бы: валовай упартасцю ў ёй. Мабыць, з-за гэтага працалюбства і кранальнай сваяцкай, кроўнай любові да зямлі – беларус і дагэтуль пераважна аратай, земляроб.

3. Гасціннасць беларусаў.

Беларус якраз адрозніваецца шчодрасцю, заўсёднай гатоўнасцю прыйсці на дапамогу ў бядзе.

Але і ў звычайныя добрыя часы ўсе, хто прыязджае да нас, адзначаюць як адну з галоўных рыс – гасціннасць... «Госць у хаце – бог у хаце» – і ганьба таму дому, дзе не зробяць усяго, нават немагчымага, каб госць быў задаволены.

4. Неацэнны скарб беларускага народа.

Рэаліст у рэальным жыцці, беларус вялікі фантаст, рамантык і летуценнік у марах.

*(Паводле Уладзіміра Караткевіча)*

Зразумела, трэба прэзентаваць сваю краіну. Але варта прадстаўляць аб'ектыўную інфармацыю, зазначаць і добрыя, і дрэнныя бакі беларускага жыцця.

## КАНЦЭПТ БАЛОТА ПА МАТЭРЫЯЛАХ БЕЛАРУСКАГА СЕЦІВА

**П. У. Куксанава**

Канцэпт *балота* належыць да ліку беларускіх этнаспецыфічных канцэптаў, якія актыўна транслююцца ў працэсе грамадскіх зносінаў, вызначаюць сістэму каштоўнасцяў і паводзінаў беларусаў.

У сваім дакладзе я паспрабую акрэсліць асноўныя вынікі даследавання канцэпта *балота* па матэрыялах беларускага сеціва. Паколькі беларускага корпусу тэкстаў, на жаль, не існуе, я карысталася пошукам Google па беларускамоўных сайтах, дзе толькі сустракалася слова *балота [google.by, knihi.com, kamunikat.org, litara.net, slounik.org, nn.by, svaboda.org, dziejaslou.by, livejournal.com, arche.bymedia.net, pahonia.promedia.by, media.catholic.by, nv-online.info, niva.iig.pl, zvyazda.by]*.

Шляхам кантэнт–аналізу 1280 кантэкстаў была зроблена класіфікацыя значэнняў, у якіх рэгулярна ўжываецца слова *балота*. Звернем увагу на схему.

Схема развіцця пераносных значэнняў




Пад нумарам адзін змешчана асноўнае лексічнае значэнне слова *балота*, якое падаецца ў «Тлумачальны слоўніку беларускай мовы» [2, 334] і якое з’яўляецца найбольш частотным па выніках эксперыменту (1–30%): *«Археалагічныя помнікі трэба шукаць паблізу ад крыніц пітнай вады, якімі былі рэчкі, ручаі, азёры, балоты»* або *«Пасля дажджоў прырэчнае балота шырока разлілося, заліло імшарыну…»*. Варта адзначыць, што слова *балота* надзвычай прадуктыўнае ва ўтварэнні тапонімаў, што знайшло свой адбітак у даследаваным матэрыяле: *«Ёсць паміж вёскамі Сурвілішкі і Дзяўгуны лес, які называюць Цыганскім балотам»* або *«я ня думаў і не жадаў патрапіць у вёску з рамантычнай назвай Белае Балота…»* ці торфазавод *«Белае балота»*. Дарэчы, спалучэнне *белае балота* зусім не выпадковае. *Балота*, як падае этымалагічны слоўнік, паходзіць ад балцкага кораня baltas, што значыць «белы, светлая багна, балота» [3, 296]. Магчыма, дапускае даследчыца Клімковіч, этымалагічна этнонім Беларусь тлумачыцца як «Краіна балотаў» ці «Белая краіна» [4].

Канцэпт <u>балота</u> амбівалентны. З аднаго боку, балота як схованка, выратаванне (2–2%) часта звязваецца з ідэяй партызанства: *«Але партызан, ён ніколі ня пойдзе, не вылезе са свайго сховішча, лесу, балота, сваёй хаты, пакуль ён не адчуе, што гэта не пагражае яму, яго асобе…»*, *«Быў час, калі балоты дапамаглі ліцьвінам і русінам уратавацца ад мангольскай навалы. Ужо за адно гэта нашы балоты*

*трэ было б уганараваць званьнем Абаронцы Айчыны і ахоўваць як нацыянальную рэліквію».* Міф пра беларускую партызанку шмат у чым абавязаны нашым лясам і балотам, якія спрадвеку спрыялі тутэйшым людзям, хавалі ў сваіх нетрах тутэйшы люд ад небяспекі.

З другога боку, балота таіць у сабе небяспеку, пагрозу жыццю (3–5%): *«Яшчэ б крыху, і магла б зусім патануць у дрыгве балота...», «Швед трапіў у балота, там патанулі яго гарматы, коні...», «А выбрацца з балота без праваднíка, ды яшчэ ноччу, было немагчыма».* Відавочна, у дадзеным выпадку балота выступае ў яго прамым значэнні, але сюды дадаюцца яшчэ фонавыя веды, дадатковая канатацыя, якая залежыць ад таго, у якія дачыненні ўступае з ім чалавек. У гэтым аспекце развілася пераноснае значэнне небяспекі, якая зацягвае, засмоктвае чалавека (6–3,5%): *«прыспеў час вырывацца з інтэрнэцкага балота», «але ў алкагольнае балота цягнула па–ранейшаму»* і г.д.

Балота ўсведамляецца як крыніца прыродных рэсурсаў (4–8,5%): гэта і ягады, і лекавыя расліны, і дзічына, і сенажаці, і ворныя землі, і нават турыстычны брэнд Беларусі. Не ўсе ведаюць, што на тэрыторыі Беларусі размясцілася самае вялікае балота ў свеце – Ельня, плошча якога 23200 га.

Пра паходжанне балота згадваецца ў касмаганічным міфе беларусаў (5–2%). Балота ёсць прататыпам першабытнага хаосу, калі Бог яшчэ не аддзяліў зямлю ад вады. Пра балоты існуе шмат легендаў і паданняў: *«Бегаў, бегаў чорт, перавярнуў усё балота. От ат таго да тых час яшчэ стаяць на балоце выжары».* Міфалагічны аспект даў падставы для развіцця пераноснага значэння (7–0,5%): *«Раптоўна мне ўявілася, як цэлы аграмадны будынак абрынаецца і сучасны чалавек ляціць галавой уніз у першабытны змрок, у першапачатковае балота», «...ідзі зліквідуй сваю непісьменнасць, а потым крычы паўсюль аб «адзінай беларускай мове», бо асноўнага не ведаеш, а ў балота кідаешся».*

Самае старажытнае пераноснае значэнне зафіксавана ў гістарычным слоўніку [1, 135]: балота ў сэнсе «гразь, бруд» (8–5%). Але ўжо ў старабеларускай мове балота выступала метафарай маральнага бруду, хлусні, граху (15–1,5%): *«в болоте ленивства, недбальства и нечулости», «жебы болотом греха не смазал».*

У мастацкай літаратуры балота стала паэтычным увасабленнем сну, забыцця: *«Балота спіць пад вэльмам чар», «На цёмнай гладзі сонных луж балота... «.* Гэтая метафара была асабліва папулярная ў літаратуры пачатку ХХ стагоддзя, калі кожны паэт лічыў сваім абавязкам абуджаць самасвядомасць тутэйшага народа, клікаць яго на змаганне за волю. Аднак падобныя асацыяцыі сустракаюцца і ў сучаснай публіцыстыцы: *«...скалануў раску таталітарнага балота і абудзіў заснулыя пачуцці», «Але ж павінна некалі і наша балота пачаць прабуджацца».*

Найбольшую цікавасць уяўляюць значэнні, якія ў ТСБМ [2, 334] пазначаны вельмі абагульнена: «Усё, што характарызуецца застоем, адсутнасцю жывой дзейнасці, маральным падзеннем». Аднак кантэкст дае падставы дакладна размяжоўваць застой, адсутнасць перспектывы, загніванне як стан душы, сітуацыю ў грамадстве (10– амаль 10%) і пасіўную, нявызначаную частку грамадства (11–5%). Адметна, што гэта ледзь не самыя частотныя канцэптуальныя метафары балота.

Цікава, што балотам моўца звычайна называе варожую для сябе сітуацыю, стан рэчаў: напрыклад, *«калхознае, апазіцыйнае, бюракратычнае, абывацельскае, нацыяналістычнае, таталітарнае, постсавецкае, рускамоўнае, чыноўнае»* і г.д. Атрымліваецца, што характар сітуацыі, акрэсленай як балота, можа вар'іравацца ў залежнасці ад суб'ектыўных уяўленняў моўцы пра тое, як мае быць. Нягледзячы на гэта, нельга сказаць, што балота мае выразна адмоўную канатацыю. Як бы паўднёвым народам ні дакучала сонца, паўночным – снег, а беларусам – балота, без усяго гэтага яны не мысляць сябе як нацыя. Гэта пацвярджаецца надзвычай частотнай спалучальнасцю балота з прыметнікамі «наша, беларускае, роднае, тутэйшае, суверэннае, айчыннае, нацыянальнае». І таму ў шматлікіх кантэкстах гучыць хутчэй не іронія, а памяркоўная згода з лёсам: *«Беларусь – ціхае балота ня столькі праз ейнага лідэра, колькі праз нязломную інэртнасць – народ папросту такі».* Адсюль вынікае далейшая канцэптуалізацыя балота як радзімы (13– каля 10%): *«балота – сымбаль занядбанай Беларусі», «Мая Айчына – ты маё Балота, з якога б уцякаць – ды неахвота».*

Беларусь і зараз шмат хто лічыць правінцыяй, таму не дзіўна, што паралельна балота пазначае таксама і перыферыю ў адносінах да цэнтра (12–2%). Не толькі таму, што ў правінцыі яшчэ захаваліся балоты, але і таму, што жыццё на вёсцы сапраўды «характарызуецца застоем, адсутнасцю жывой дзейнасці, маральным падзеннем»: *«Яшчэ ў 80–х філфак карыстаўся ўстойлівай рэпутацыяй «балота». Якая пэрспэктыва ў выпускніцы філфаку? Паехаць у вёску, каб выкладаць дзецям мову і літаратуру...», «Навошта ты вёз мяне сюды, у гэтае балота, лепш бы я была ў Вільні».*

Надзвычай часта балота ўжываецца ў значэнні пасіўнай, нявызначанай часткі грамадства, часцей – электарату (11–5%). Апрача таго, што нетрывалыя думкі параўноўваюцца з нетрывалай глебай балота, тут яшчэ адыгрывае сваю ролю метанімічны перанос – з прасторы на яе насельнікаў. *«І якое жахлівае балота – 31,6% увогуле не змаглі даць уцямнага адказу!», «Кампанія была скіравана на «балота» – выбарцаў без пэўнае пазіцыі».*

Адметнасць беларускага ландшафту стала вызначальнай адметнасцю нацыянальнай свядомасці, светапогляду, што адлюстравалася ў

нацыянальным стэрэатыпе, пра што сведчаць наступныя цытаты: *«Як жа ў вас у Мінску метро будуюць, калі ў вас там адны балоты?» «У вас, у Беларусі, наогул прыгожа. Некалі мне здавалася, што тут адны балоты. Чытаў пра гэта нават у кніжках». «Балота балотам, але ад гэтых партызанскіх дзяцей чаго заўгодна чакаць можна!» «Захацелася з РСФСР дамоў. У ціхую, як балота, БССР. Ну, не такія мы, як рускія…»* Такім чынам, канцэпт балота выступае як сімвал Беларусі, ментальны архетып і нацыянальны стэрэатып беларусаў (14–3%): *«Мы беларусы – людзі балота. Дзеці стаячай вады... «*

Варта адзначыць, што балота ўступае ў шырокія спалучальныя сувязі, у тым ліку фразеалагічныя (16– каля 4%). Сярод звыклых фразеалагізмаў вылучаецца наватвор «Бангалорскае балота» (17–2,5%), які ўзнік зусім нядаўна і сімвалізуе паразу апазіцыі ў барацьбе супраць улады: *«Прамаскоўская апазіцыя водзіць людзей на ганебнае балота Бангалор і выдае гэты абсурд за барацьбу», «Мы заклікалі не сыходзіць на балота, таму што губляўся сэнс пратэсту».*

Балота вельмі прадуктыўнае ва ўтварэнні аказіянальных метафар: *«Менавіта ўзгорысты краявід, у адрозненне ад балота мадэрнізму, я б назвала адпаведнікам традыцыяналізму ў літаратуры... «, «Надта ж Андрэй, бы жаба ў балота, у палітыку прэцца».* Трэба адзначыць, што, паводле падлікаў, балота выступае як канцэптуальная метафара ў кантэксце часцей (52,5%), чым балота ў яго прамым значэнні (47,5%).

Трансляцыя канцэпта праз творы і з'явы мастацтва пацвярджае важнасць канцэпта для пэўнай культуры. Вось толькі некалькі літаратурных твораў («Людзі на балоце» І. Мележа, «Сон на балоце» М. Кудзелькі, «Балотны агонь» Я. Коласа, «Балота» С. Фаміна і «Балота» В. Быкава, «Было балота» А. Разанава, «Людзі на балоце» Л. Вольскага і г.д.). А супольная выстава беларускіх мастакоў у Кіеве С. Войчанкі, У. Цэслера, Р. Вашкевіча і А. Клінава так і называлася «Балота–Empire».

Праявы канцэпта балота мы сустракаем на кожным кроку: гэта назва племя дрыгавічоў; мянушка дзяржаўнага сцяга; назва торфазавода; назва «дурызматычнага парталу» www.balota.narod.ru; назва старонкі жж–юзера; найменне палітычнай стратэгіі і прынцыпу паводзінаў…

Адным словам, балота працінае ўсе сферы жыцця беларусаў, нават тых, хто ніколі не выязджаў з забрукаванае сталіцы і балота ніколі не бачыў.

**Літаратура:**


1. Гістарычны слоўнік беларускай мовы. Вып. 2. 'Биець – Варивный'. Мн., 1983.
2. Тлумачальны слоўнік беларускай мовы. Т. 1. Мн., 1977.
3. Этымалагічны слоўнік беларускай мовы. Т. 1. А-Б. Мн., 1978.
4. *Клімковіч І.* Чортава вока. Эсэ. // Дзеяслоў, №7 або Інтэрнэт–адрас: http://www.dziejaslou.by/inter/dzeja/dzeja.nsf/htmlpage/klim7?OpenDocument